**Аляксандр АГЕЕЎ**
*Магілёў, Беларусь.*

# НАПАЛЕОНАЎСКІЯ ВОЙНЫ І ЛЁС МАГІЛЁЎСКІХ ЯЎРЭЯЎ

Пачатак XIX ст. азнаменаваўся ў гісторыі Еўропы буйнейшымі ваеннымі падзеямі, у якіх удзельнічала і Расія. Старая Еўропа не магла змірыцца з рэвалюцыйнымі заваяваннямі Францыі, якая супрацьстаяла ўсяму кантыненту. Расійская імперыя была актыўным удзельнікам антыфранцузскіх кааліцый. Нягледзячы на заключэнне ў 1807 г. Тыльзіцкага міра і падпісання ў 1808 г. Эрфурцкай саюзнай канвенцыі з Францыяй, Расія, пачала з 1810 г. інтэнсіўна рыхтавацца да новай вайны, якая і ўзрушыла ў 1812 г. усходнюю Еўропу.

Яўрэі Беларусі былі уцягнуты ў віхор ваенна-палітычных падзей таго часу таксама як і іншыя народы Расіі. Цяжар падрыхтоўкі да вайны лёг перш-наперш на плечы шэраговых расійскіх падаткаплацельшчыкаў. Пры гэтым асабліва цяжка даводзілася насельніцтву прыгранічных губерняў — тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага, на якой пражывала асноўная частка расійскіх яўрэяў. Тутэйшыя жыхары не толькі плацілі значна ўзрослыя падаткі, але вымушаны былі масава ўдзельнічаць у ваенным будаўніцтве, у тым ліку і Бабруйскай крэпасці, ва ўтрыманні шматлікіх ваенных гарнізонаў. Адмоўна адбіваліся на іх матэрыяльным становішчы армейскія пастоі і рэквізіцыі пад час войнаў 1805 — 1807 гг., калі расійскія войскі праз беларускія землі, у тым ліку і Магілёўшчыну, рухаліся ў Еўропу.

Пастоі выклікалі стабільнае незадавальненне мяшчан і сялян Магілёўшчыны. Нягледзячы на ліпеньскае 1808 г. прадпісанне Міністра унутраных спраў аб раўнамернасці гэтай павіннасці, ад жыхароў Магілёва скаргі на праблемы звязання з пастоем не прыпыняліся ні до, ні пасля вайны 1812 года. У гэтай справе назіраліся шматлікія парушэнні інструкцый, нераўнамернасць у размеркаванні пастаяльцаў па дамах, у тым ліку паміж хрысціянскімі і яўрэйскімі жыхарамі горада, хабарніцтва,... і, натуральна, скаргі. [3, л.6 — 8; 4; 5; 6] Часта скардзіліся заможнія магілёўскія яўрэі. [4; 5] Яны імкнуліся адкупіцца ад павіннасці, якая не толькі пагаршала жылёвыя ўмовы, але і моцна ўскладняла праявдзенне рэлігійных абрадаў.

1812 год прынёс беларускім яўрэям, як і ўсім жыхарам Беларусі, яшчэ больш страшныя выпрабаванні. Тэрыторыя краіны з самага пачатку вайны стала арэнай баявых дзеянняў. У Магілёў французскія войскі маршала Даву ўступілі 8 (20) ліпеня, а да канца месяца ўжо практычна ўся сучасная Магілёўшчына, за выключэннем раёна Бабруйска была занята французамі. Абодзьве арміі праводзілі масавыя рэквізіцыі для сваіх патрэб. І тая і другая выкарыстоўвалі яўрэяў у якасці разведчыкаў.

Нягледзячы на замацаваныя ў гістарычнай літаратуры традыцыйныя ўяўленні аб паводзінах французкай арміі, аб разрабаванні гарадоў і вёсак Беларусі, ва ўспамінах сведкаў вайны згадак аб масавых рабунках французаў ў гарадах Магілёўшчыны, як правіла, няма.Больш таго, амаль усе адзначалі карэктныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паводзіны французаў. Так жыхары Магілёўскай губерніі пісалі ў сваіх успамінах: "... французы ўвогуле вялі сябе прыстойна і не было нараканняў на іх" [9, с.236], "... не магу сказаць, каб гэтыя атрады займаліся рабункамі і гвалтам". [18, с.693] У этнічна-французскіх злучэннях была даволі высокая дысцыпліна, Марадзёрства імкнуліся выкараняць у зародку. Асабліва строгімі былі парадкі ў корпусе маршала Даву. А вось нямецкія злучэнні "асабліва ласкавым абыходжаннем" з жыхарамі Беларусі не запомніліся. Баяздольнасць і дысцыпліна ў іх былі ніжэйшыя. Гэтую асаблівасць адзначаюць і некаторыя расійскія гісторыкі. Так, Н.А.Троіцкі прама піша, што чынілі рабункі і гвалты "галоўным чынам не французскія часці", а ў першую чаргу нямецкія: вестфальскія, баварскія і інш..". [19, с.52] На Магілёўшчыне этнічна-нямецкіх войск было няшмат. Большую частку лета ў гарадах края знаходзіліся войскі герцагства Варшаўскага, або сфарміраваныя ў Літве і на Беларусі. Дысцыпліна ў іх таксама была слабейшая, чым у фрунцузаў. Яны прычынілі нямала бед яўрэям Магілёва. Агульнага рабавання па сведчанням сучаснікаў падзей аднак не было. [9, с.236]

Безумоўна тое, што французская армія эксплуатавала рэсурсы краю. Насельніцтва было абкладзена вялікімі падаткамі. Памеры ж рабавання ў літаратуры (асабліва ў падручніках гісторыі) відавочна перабольшваліся. Так, у Магілёве не было рабунку, хаця многія лаўкі яўрэяў былі ўзламаныя.[9, с.236] У Чавусах яўрэйскія кабакі былі "разбіты" пасля сыходу рускіх войск і яшчэ да прыходу французскіх. Так што да з'яўлення французаў "чернь" паспела ўдосталь пакарыстацца дармавой гарэлкай.[18, с.691] З прыходам французаў усталяваўся пэўны парадак. Многія багатыя жыхары самі запрашалі французаў да сябе з мэтай аховы сваіх дамоў ад злодзеяў і рабаўніцтва. .[9, с.236] Хто тут больш рабаваў: войскі, марадзёры ці мясцовыя рабаўнікі, з успамінаў і дакументаў не зусім зразумела. Але не падлагае сумненню тое, што ў выніку ваенных дзеянняў магілёўскія яўрэі панеслі значныя матэрыяльныя страты.

Гарадское насельніцтва падпарадкоўвалася французскім уладам, спраўна збірала падаткі, абслугоўвала французскую армію. У гарадах быў арганізаваны рамонт і выраб амуніцыі, рыштунку. У будынку Магілёўскай праваслаўнай семінарыі хрысціяне і яўрэі мылі на французскія і польскія паўкі мундзіры і боты і ўсё патрэбнае.[1, с.LXXXI, XXXII] За кошт мясцовых падаткаў і збораў фарміраваліся мясцовыя органы ўлады, нацыянальная гвардыя і г.д. Падобная сітуацыя была і ва многіх мястэчках. Напрыклад, быхаўскія шаўцы выконвалі французскія заказы, а адзін толькі кагал мястэчка сабраў каля 7 000 руб. на ўтрыманне нацыянальнай гвардыі. [7, л.1-7].

У літаратуры пазіцыя яўрэяў да ваяваўшых бакоў апісваецца супярэчліва. У сучасных беларускіх выданнях гэтаму пытанню прысвечаецца толькі некалькі старонак у якіх, падкрэсліваеца, што "немалая колькасць беларускіх яўрэяў прыняла актыўны ўдзел у Айчыннай вайне 1812 года на баку рускай арміі", што яны "былі добрымі разведчыкамі і ўмелымі забеспячэнцамі". Узгадваецца дзейнасць яўрэйскіх лазутчыкаў, прыводзяцца прыклады дапамогі яўрэяў рускім войскам ды ўказваецца на значэнне "яўрэйская пошты". [13, с.187, 188; 14, с.46, 47]. У некаторых работах вывад яшчэ больш катэгарычны: "беларускія яўрэі падтрымалі рускі бок" многія раввіны прадказвалі пагібель Вялікай Арміі". [16, с.12]. Падобныя погляды выказваюцца і ў некаторых замежных выданнях.[15, с.23, 24]



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сапраўды ў найбольш грунтоўнай працы па гэтаму пытанню С.М.Гінзбурга “Отечественная война 1812 года и русские евреи”, якая была выдадзена яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя, даказваецца, што “рускае яўрэйства выявіла ... актыўную адданасць Расіі, варожасць непрыяцелю”. У ёй узгадваюцца шматлікія прыклады дапамогі яўрэяў рускім войскам, у тым ліку і на Магілёўшчыне. Так, дзякуючы паведамленню Нісана Кацэнельсона казакі пад Бабруйскам разбілі атрад французаў. У Шклове быў павешаны нехта Эцінгон за тое, што ён адмовіўся паказаць французам шлях на Магілёў. Пераказваецца чуллівае паданне, якое захавалася ў магілёўскай сям'і Ратнераў, аб паездцы Хаіма Ратнера па заданню магілёўскага губернатара ў разведку. Указваецца, што “відаць” праз яўрэйскую пошту Аляксандр I атрымаў першае паведамленне аб пераправе Напалеона праз Нёман. [12, с.71, 83]

Многія расійскія ваенаначальнікі таксама ўзгадвалі прыклады дапамогі яўрэяў. Але, успаміны сведкаў вайны, якія заставаліся на тэрыторыі занятай французамі малююць крыху іншую карціну. Яўрэі, як народ практычны і асцярожны ў адносінах з уладамі, захоўвалі знешні спакой. У Чавусах “Пры набліжэнні войска Напалеона ў яўрэяў не было відаць ні радасці, ні страху, ні смутку, ні маркоты...” [18, с.689] Іх багатая шматвекавая гісторыя мабыць падказвала ім, што усё перамелецца. Праўда, калі новая ўлада ўсталявалася, яўрэі былі лаяльнымі да яе. Яны прысягнулі імператару Францыі, выконвалі загады, рабілі неабходныя пастаўкі. Сведка падзей таго часу ў Магілёве К.К.Арнольдзі ва ўспамінах пісаў, што яўрэі “У час знаходжання французаў намагаліся ў размовах пазбягаць рускай мовы і гаварылі пераважна па-польску, нават рускія грошы прымалі толькі са скідкай. Па выгнанні ж непрыяцеля ўсё змянілася — пачалі размаўляць па-руску і замежная манета страціла ў іх нармальны кошт”. [9, с.236] Той жа Гінзбург прызнаваў, што сярод яўрэяў Беларусі і Літвы было, безумоўна, немала тых, хто адносіўся да тагачасных падзей “з індыферэнтызмам”, што магчыма былі асобныя яўрэі, якія “з карысці, або страху” аказвалі паслугі непрыяцелю. [12, с.46, 47] Больш пэўна выказваюцца замежныя даследчыкі: “У 1812 Вялікая Армія выкарыстоўвала яўрэяў і як шпіёнаў, і як забеспячэнцаў неабходнага правіянта...”. [20, с.30]

Розныя ацэнкі адносін яўрэяў да вайны ў гістарычнай літаратуры маюць аб'ектыўную падставу — супярэчлівасць становішча французскай арміі на Беларусі. Палітыка Францыі гэтага часу — гэта палітыка захопу — з аднаго боку, і — асветніцтва і вызвалення ад феадалізму з другога. Апошняя, у сваю чаргу, неадназначна ўспрымалася ў розных колах яўрэйства. Многія яўрэі звязвалі з французамі надзеі на ліквідацыю тых эканамічных і палітычных абмежаванняў, якія ўвялі для іх расійскія ўлады. Созыв у 1806 г. схода яўрэйскіх нотаблей, а ў 1807 г. у Парыжы агульнаеўрэйскага яўрэйскага Сінедрыёна, паляпшэнне становішча французскіх і нямецкіх яўэряў, абяцанне аднаўлення гістарычнай радзімы на Святой зямлі рабіла Напалеона дужа папулярным сярод яўрэяў Еўропы. Беларускія яўрэі ў большасці меркавалі, што “Напалеон прыязна ставіцца да яўрэяў”. [11, с.516] У той жа час рэвалюцыйныя навацыі французаў выклікалі недавер артадаксальных яўрэяў Беларусі. У рэвалюцыйнай Францыі яны бачылі “сканцэнтраванне бязбожнасці”. [16, с.12] Многія яўрэйскія раввіны баяліся падрыва асноў іўдаізма, паслаблення ўлады кагалаў, некаторыя з іх прадказвалі пагібель Вялікай Арміі Напалеона.

Лідэр беларускіх хасідаў-хабаднікаў Шнеур-Залман нарадзіўся ў 1747 у Ліёзна Магілёўскай губерні, быў вучнем распаўсюджвальніка хасідызма Бера, пражываў у Магілёве, Ліёзна. З 1788 г. становіцца агульнапрызнаным главой хасідаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларусі. Двойчы арыштоўваўся па наветах іншых рэлігійных дзеячоў іўдаізма. Пасля вызвалення пераўтварыў мястэчка Ляды Магілёўскай губерні ў сапраўдную рэзідэнцыю беларуска-літоўскага хасідызму.

У 1798 г. (ці 1800) Шнеур Залман зрабіў кабалістычным шляхам прароцтва лёса Напалеона. Ён узяў з Бібліі 24 словы, якія састаялі з 96 літар іврыта ст.41 — 42 гл.XXII Другазаконня і шляхам перамяшчэння іх скамбінаваў новую фразу, якая абвяшчала: "Верхаводы мяцежнікаў французскіх сперва будуць мець поспех, але ў канцы будуць пасаромлены, бо цар (цары?) праўды адпомсціць ім, засячэ іх мячом і пакарыць, і загіне муж Банапарт — тады свет супакоіцца і ўзрадуецца". [11, с.516; 12, с.55 — 56]

Пасля пачатку вайны ён заклікаў сваіх паслядоўнікаў дапамагаць рускай арміі, а пры набліжэнні французаў да Лядаў выехаў з сям'ёй з мястэчка разам з рускай арміяй і памёр у ўцекачах. Прычыну такой пазіцыі Шнеура Залмана тлумачыць прыпісваемае яму выказванне: "...мне было яўлена (з нябес), што калі Банапарт возьме верх, то сярод яўрэяў узрасце багацце і лёс іх паправіцца, але дзеці Ізраіля будуць адарваны і аддалены ад Айца нябеснага. Калі ж адалее наш цар Аляксандр, то пэўна ўзрасце беднасць сярод яўрэяў, і ўдача адвернецца ад іх, але затое сэрца дзецей Ізраіля злучыцца з іх Айцом нябесным". [15, с.271]

Нягледзячы на прадсказанні многіх іудзейскіх лідэраў паражэння французаў, яўрэі не маглі быць упэўнены ў выніку ваеннай кампаніі, асцярагаліся рабавання з боку войск і ў сілу свайго залежнага становішча вымушаны былі дапамагаць абодвум бакам канфлікта з надзеяй на будучыя дзевідэнты.

Факты дапамогі яўрэйскага насельніцтва рускай арміі ва ўспамінах і літаратуры, на наш погляд, безумоўна перабольшваюцца, выпучваюцца заднім чыслом. Перамажы ў 1812 годзе Францыя, і сёння мы пэўна мелі б шматлікую літаратуру аб дапамозе беларусаў, яўрэяў французам. Але нават тыя прыклады дапамогі яўрэяў рускім, якія паўтараюцца ў розных выданнях, зусім не так адназначны, як уяўляецца. Шкоўскага яўрэя Эцінгона растралялі за тое, што ён не паказаў французам шлях на Магілёў, бо гэта супярэчыла яўрэйскім законам — "запаведзям Божым", [12, с.83; 17, с.24] а не за тое, што дапамагаў рускім. Мажліва, што той нешчаслівы для Эцінгона дзень проста быў суботай. Нягледзячы на тое, што ў некаторых сучасных публікацыях Хаіма Ратнера называюць "разведчыкам з Магілёва" [17, с.24], што ён зрабіў ў ці рабіў што-небудзь упэўнена мы сказаць не можам. Аб ім засталося толькі паданне, што было зафіксавана праз стагоддзе пасля падзеі.[12, с.78, 79].

У сувязі з вышэй пералічаным больш узважанай уяўляеца пазіцыя выказаная яшчэ ў дарэвалюцыйных публікацыях Юлія Гессена. "Айчынная вайна прынесла яўрэйскаму насельніцтву многа бедстваў, матэрыяльныя страты і маральныя пакуты... Рускія і непрыяцельскія афіцэры прымушалі яўрэяў быць лазутчыкамі, і многія палі ахвярамі палявых судоў. Аднак, яўрэі часцяком дабраахвотна даносілі рускім аб руху французскіх войск. Урад ахвотна карыстаўся яўрэямі як пастаўшчыкамі".[10, с.176]

Вайна 1812 года пакінула глыбокі след у гісторыі, літаратуры, фальклоры народаў Беларусі. Яе вынікі ва многім вызначылі далейшае развіццё краіны і становішча яўрэяў у ёй. У гісторыі яўрэяў Магілёўшчыны падзеі вайны мелі і некалькі нечаканы крымінальны працяг.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Летам 1812 перад адступленнем расіяне спрабавалі арганізаваць эвакуацыю матэрыяльных каштоўнасцяў, чыноўнікаў і... злачынцаў. У ліку апошніх у Ніжні Ноўгарад былі адпраўлены чавускі мешчанін Абрам Моўшавіч, магілёўскі мешчанін жыхар мястэчка Шклоў Хаім Іцкавіч, шклоўскі жыхар Вяльвель Абрамаў. Ці то расійскі клімат ацвярозіў магілёўскіх яўрэяў, ці то быў час падумаць аб вечным,але неўзабаве яны прынялі грэчаскае (праваслаўнае) веравызнанне, змянілі свае імёны, адзенне і апынуліся на свабодзе. Праўда, праз пэўны час новахрысці зніклі, а губерня была ўзрушана крадзяжом з ніжагародскай удзельнай канторы 60 000 (шасцідзесяці тысяч) руб. — фантастычнай для пачатку XIX ст. сумы.

Сляды верагодных злачынцаў вялі назад у Магілёўскую губерню, дзе яўрэяў, якія ўжо вярнулі свае імёны і яўрэйскую адзёжу, затрымалі і забралі 6 510 руб. Дзевяць дзесятых скрадзеных грошаў знікла. У выніку следчых дзеянняў у злачынцаў, ды іншых яўрэяў губерні ўсёж было вернута 9 623 руб. 25 кап., для чаго праводзіліся вобыскі ў яўрэйскіх дамах. Арыштанты назвалі імёны сваіх саўдзельнікаў і супольнікаў з ліку яўрэяў і хрысціян. Героі гучнай справы ў 1815 годзе былі этапіраваны ў Ніжні Ноўгарад, а канфіскаваныя грошы адпраўлены “куда следует”.[2]

Яшчэ больш шчыльна з падзеямі вайны была звязана справа, якую ініцыіравалі быхаўскія яўрэі супраць памешчыка Крогера, і якая цягнулася каля двух дзясяцігоддзяў. Быхаўскі павятовы маршалак Пётр Крогер стаў у 1812 годзе падпрэфектам Быхаўскага дыстрыкта (павета) і сабраў з мясцовага кагала каля 7 000 руб. на абмундзіраванне і ўтрыманне нацыянальнай гвардыі, што стваралася з ліку тутэйшых жыхароў. Пасля заканчэння маскоўскай кампаніі прадстаўнікі быхаўскага кагала неаднаразова патрабавалі або вярнуць іх грошы, або залічыць іх у кошт недаімак. У 1813 годзе губернскае праўленне прыняло рашэнне аб взысканіі з памешчыка грошаў, або маёнтка. Але справа зацягнулася, абрасла паперамі, яе матэрыялы некалькі разоў праходзілі ўсю іерархію судзебнай сістэмы Расійскай імперыі. Агульныя прэтэнзіі быхаўскіх яўрэяў паступова зніжаліся з 7 300 да 7 000, а потым да 6 224 руб. У 1819 і 1820 г.г. з Крогера ўдалося ўзыскаць 2 048 руб. 96 кап. і пагасіць ім недаімкі кагала. У адказ на яго скаргу Міністэрства юстыцыі прадпісала губернатару правесці канчатковае расследванне, якое цягнулася яшчэ 9 гадоў. У выніку, з былога падпрэфекта пастанавілі ўзыскаць дадаткова 175 руб. 4 кап., на якія ён не меў апраўдальных дакументаў. Патрабаванні быхаўскіх яўрэйскіх краўцоў аб вяртанні ім грошаў за шыццё амуніцыі для французаў было адхілена. Кагал дабіўся частковага поспеху. Але цікава, што законнасць выкарыстання на карысць французаў 4 000 руб. на якія меліся хаця б якія-небудзь паперы не аспрэчвалася[7; 8]

Расія здолела перамагчы самага магутнага заваёўніка XIX стагоддзя. Але перамога нарадзіла самазаспакоеннасць, прыпыніла рэформы і спрыяла кансервацыі адсталых сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін у краіне. Вайна 1812 года не спраўдзіла надзеі большасці жыхароў Беларусі. Шляхта так і не здоліла адрадзіць Вялікае княства Літоўскае і Рэч Паспалітую. Сяляне так і не дачакаліся вызвалення ад прыгоннага права. Не змянілася да лепшага пасля вайны і становішча магілёўскіх яўрэяў. Калі ва многіх яўрапейскіх краінах у гэтую эпоху пачалася яўрэйская эмансіпацыя, то ў Расіі пасля вайны абмежаванні для яўрэяў сталі яшчэ больш жорсткімі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літататура:


1. Археографический сборник документов, относящихся к истории северо-западной Руси. т.II. — Вильно, 1867.
2. *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф.1297, воп.1, спр.143.*
3. Там жа. — спр.201.
4. Там жа. — спр.203.
5. Там жа. — спр.210.
6. Там жа. — спр.212.
7. Там жа. — спр.543.
8. Там жа. — спр.2012.
9. Арнольди К.К. Французы в Могилёве-на-Днепре //Русская старина. — 1873. — август.
10. Гессен Ю. История еврейского народа в России. — Москва, Иерусалим., 1997, 5753.
11. Я. Гессен Ю. Наполеон Бонапарт //Еврейская энциклопедия. — т.XI. — СПб.
12. *Гинзбург С.М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. — СПб., 1912.*
13. Евреи. По страницам истории. — Мн., 1997.
14. Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев в Беларуси. Краткий научно-популярный очерк. — Мн., 1997.
15. *Клиер Дж.Д. Россия собирает своих евреев. (Происхождение еврейского вопроса в России: 1772 — 1825).* — Москва — Иерусалим, 2000, 5760.
16. Кузняева С. Еврейские общины Беларуси в конце XVIII — начале XX века. — Мн., 1998.
17. Левин В., Мельцер Д. Чёрная книга с красными страницами (Трагедия и героизм евреев Беларуси). — Балтимор, США. 1996.
18. Романовский А.М. Французы в г.Чаусах в 1812 году (из воспоминаний очевидца) //Русская старина. — 1877. — т.XX.
19. Троицкий Н.А. 1812. Великий год России. — М., 1988.
20. Hartley J. Napoleon in Russia: Saviour or Antichrist? //History today. — 1991. — january. — С.28 — 34.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова